# 1919

## Нота ўраду Польшчы

2.1.1919
№ 1962
м. Гродня

Пану
Міністру Заграпічных Спраў
Польскай Рэчыпаспалітай

З прычыны расьпісаньня Польскім Урадам выбараў у польскі Ўстаноўчы Сойм на этнаграфічна і гістарычна беларускія паветы Беластоцкі і Бельскі Рада Народных Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі 14 сьнежня 1918 году паслала на імя Міністра Заграпічных Спраў Польскай Рэчыпаспалітай ноту пратэсту проці гэтага акту[1], раўназначнага анэксіі Беларускай зямлі і парушэньню сувэрэнных правоў Беларускага народу на яго зямлі. Жадаючы захаваць найлепшыя суседзкія адносіны з Польскім народам, Рада Народных Міністраў пры гэтым адзначыла, што ўтрыманьне ў сіле дэкрэту Польскага Ўраду аб выбарах у польскі Ўстаноўчы Сойм у часьці яго, датыкаючай Бельшчыны і Беласточчыны, можа мець вельмі благія пасьледзтвы ў сфэры беларуска–польскіх адносін, за што адказ ляжа на Польскі Ўрад.

Нягледзячы на гэта, Польскі Ўрад ня толькі не ўчыніў ніякіх крокаў дзеля скасаваньня няпраўна выданага акту, але новым актам нарушае натуральнае права Беларускага народу на самаазначэньне і непадзельнасьць яго тэрыторыі. Акт гэты — новы дэкрэт Польскага Ўраду, апавешчаны польскай прэсай, аб далучэньні да Польшчы беларускага Аўгустоўскага павету Сувальскай губэрні.

Аўгустоўскі павет паводлуг складу свайго насяленьня — бясспорна беларускі, што ўстаноўлена як урадовай статыстыкай, так і бесстароннымі навуковымі этнаграфічнымі досьледамі; апроч таго, ён рэзка аддзелен ад Польшчы сваімі натуральнымі граніцамі. І ў анэксіі гэтай новай часьці Беларускай зямлі Рада Народных Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі бачыць выяўленьне польскай імпэрыялістычнай палітыкі, праціўнай праву народаў на самаазначаньне і элемэнтарным асновам дэмакратызму. Заяўляючы свой самы энэргічны пратэст проці гэткай палітыкі, сыстэматычна нарушаючай сувэрэнныя правы Беларускай Народнай Рэспублікі, Рада Народных Міністраў папярэджвае Польскі Ўрад, што проці выразнага гвалту над Беларусьсю, учыненага Польскай Рэчыпаспалітай, яна адначасна з гэтым пасылае свой пратэст усім вялікім дзяржавам з просьбай прыняць на сябе абарону цэласьці і непадзельнасьці Беларусі ад польскага імпэрыялізму[2].

## Нота дипломатическим представителям США, Англии, Франции, Италии

Белорусский народ, достигающий своей численностью свыше 12 000 000 и занимающий пространство бывших русских губерний: Виленской, Гродненской, Минской, Витебской, Могилевской, части Смоленской, Черниговской, Сувалкской и др.[1], в течение свыше ста лет находился под властью России, под которую попал вместе с предательски поработившей его Польшей, с которой находился в добровольной государственной унии[2].

Война и революция в России способствовали освобождению белорусов, которые, возрождаясь национально, приступили к восстановлению и своих суверенных прав и, объявив на